# Любаншчына

## Ад рэвалюцыі 1917 года да Вялікай Айчыннай вайны

Вуліца Першамайская ў м. Любань. 1936 г.





Мост цераз р. Арэсу. 1935 г.

# Сёння вы даведаецеся ...

* *17 ліпеня 1924 г. быў арганізаваны Любанскі раён ...*
* *Кароткі спіс калгасаў і саўгасаў Любанскага раёна (1936)...*
* *Па старонках раённай газеты «Калгаснік Любаншчыны»...*
* *Даследчык роднага краю...*
* *Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг...*
* *Засталася памяць...*
* *Фотаздымкі горада Любані ад рэвалюцыі да Вялікай Айчыннай вайны...*
* *Герб горада Любані ...*

# *Кароткі спіс калгасаў і саўгасаў Любанскага раёна (1936)…*

| | Найменне калгасу | Населены пункт | *Год адукацыі* |
|---|---|---|---|
| 1. | «Ударник» | Любань | 1931 |
| 2. | «Перамога» | Орлево | 1933 |
| 3. | «Чырвоная змена» | Сорочи | 1931 |
| 4. | «Чырвоная зорка» | Таль | 1929 |
| 5. | «Комсомолец» | Костюки | 1931 |
| 6. | «Серп и молот» | Дубники | 1931 |
| 7. | «2-я пятилетка» | Веженка | 1934 |
| 8. | «Новы шлях» | Заболоть | 1929 |
| 9. | «Зара камуны» | Редковичи | 1930 |
| 10. | «Новы мір» | Чабусы | 1930 |

# 17 ліпеня 1924 г. быў арганізаваны Любанскі раён …

17 ліпеня 1924 г. быў арганізаваны Любанскі раён з цэнтрам у мястэчку Любань. Плошча раёна складала 1600 кв. км, налічвалася 224 населеныя пункты, у якіх пражывала 30 140 чалавек. Сялянскіх гаспадарак — 5679. Пасля далучэння да Любанскага раёна Гарадзяціцкага сельскага савета плошча раёна павялічылася да 1657 кв. км, колькасць населеных пунктаў узрасла да 347. У 1928 г. у раёне пражывала 33 838 чалавек, 31 678 з іх — у сельскай мясцовасці.

7 — 8 снежня 1924 г. у м. Любань праходзіў раённы з'езд саветаў, на якім прысутнічала 59 чалавек з правам рашаючага голасу і 10 чалавек з правам дарадчага. З прывітальным словам да дэлегатаў звярнуўся старшыня Любанскага райвыканкома Багушэвіч.

У склад райвыканкома былі абраны Штыцько, Арапучык, Мурашкевіч, Марукевіч, Гальчэня, Іваноў, Севасцьянчык, І. Каратчэня, А. Кацнельсон і тры кандыдаты — У. Сумар, П. Лагун і Д. Пякельнік. Старшынёй Любанскага райвыканкома абраны Марукевіч. Багушэвіч адазваны ў акрвыканком.

# Па старонках раённай газеты «Калгаснік Любаншчыны»…

* *Бяздзейнасць і самацёк прычыны зрыву…*

  *Мабілізацыя сродкаў па Рачэнскаму сельсавету праходзіць марудна. На 17 верасня заданне па сельгаспадатку выканана на 54,4 працэнта (налічана 22 350 р., выканана 12 225 р.). Гпаступленне плацяжоў пушчана на самацёк. Сельсаветчыкі заяўляюць: «Прынясе селянін грошы, то мы прымем безадказна». Масавай працы сярод сялянства няма, націску на кулацка-заможную частку сельсавет не робіць.*

  *У в. Закальное сельсавет яшчэ не выпісаў паведамленняў кожнаму селяніну, ніводзін селянін не ведае, колькі яму налічана самаабкладання.*

  *Спецкор*

  *26 верасня 1932 г.*

# Даследчык роднага краю…



* Аляксандр Іосіфавіч Крукоўскі — вучоны, нястомны даследчык роднага краю, этнограф і гісторык. Нарадзіўся 23 лютага 1901 г. у в. Загалле ў мнагадзетнай сялянскай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у Загальскай царкоўнапрыходскай школе, потым паступіў у Слуцкую духоўную семінарыю. Аляксандр Крукоўскі скончыў яе на выдатна, але царкоўным служыцелем не стаў, ён марыў працаваць на асветніцкай ніве. А. І. Крукоўскі настаўнічаў у сваёй вёсцы, потым вучыўся на курсах беларусазнаўства ў Мінску. У Мазыры выкладаў беларускую мову і літаратуру, працаваў у акруговым аддзеле народнай асветы. Ён быў адным з найбольш актыўных ініцыятараў разгортвання краязнаўчага руху на Мазыршчыне.

# Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг.

АНІСІМАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. у 1907 г., загінуў у 1940 г.
БАРЫСЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч, н. у в. Чабусы, загінуў 3.2.1940 г.
БЯЛЬКЕВІЧ Канстанцін Пятровіч, прапаў без вестак у 1940 г.
ВАРОНІН Пётр Іванавіч, н. у 1910 г. у м. Урэчча, загінуў у 1940 г.
ВЕРАМЕЙЧЫК Герасім Фёдаравіч, памёр ад ран 27.12.1939 г.
ВЯРОЎКА Сямён Апанасавіч, н. у 1914 г. у в. Таль, загінуў у 1940 г.
ГАЛАЙ Аляксей Васільевіч, н. у 1902 г. у в. Арлёва, загінуў 26.12.1939 г.
ГАРБУЗ Адам Нічыпаравіч, н. у 1914 г. у в. Касцюкі, загінуў у 1940 г.
ГАРЧАНІН Тарас Яўхімавіч, н. у 1906 г. у м. Урэчча, загінуў у 1940 г.
ГОМЗА Максім Ільіч, н. у 1905 г. у в. Обчын, рад., прапаў без вестак у 1940 г.
ГУК Рыгор Міхайлавіч, н. у 1915 г. у в. Баянічы, рад., загінуў 27.12.1939 г.



ЖУК Пілін Савіч, н. у 1907 г. у м. Урэчча, рад., загінуў у 1940 г.

# Засталася памяць...

Ва ўсе часы і ва ўсіх бітвах прымалі ўдзел нараджэнцы Любаншчыны, праслаўляючы свой край мужнасцю і адвагай. Такі народ тут жыве — ціхмяны, працавіты ў мірны час, ваяўнічы і рашучы ў гадзіну небяспекі для краіны... Не зганьбілі, не падвялі любанцы свой край і ў гады мінулай вайны, многія з іх пакрылі сябе неўміручай славай. Адзін з такіх малавядомых герояў — Павел Раманавіч Алейнікаў.

Нарадзіўся П. Р. Алейнікаў у 1917 г. у в. Лапачоў Брод у беднай сялянскай сям'і. У савецкі час закончыў сямігодку, працаваў настаўнікам у в. Дубнікі. У 1937 г. яго прызвалі ў армію. Закончыў вучэбнае падраздзяленне і ў званні сяржанта пачаў армейскую службу.



# Фотаздымкі горада Любані ад рэвалюцыі да Вялікай Айчыннай вайны…






# Герб горада Любані ...



Варажскі шчыт пересечаны па ек
чырвонага колеру. У верхнім б ветка, на
лісці якога дзве птушкі з падня
Город Любань вядомы як мяст кыла ў
XVI у Алельковічам, з 1589 г. - Т
У любым геральдычным зна суць
вызначаную нагрузку і могуць астацка-
эстэтычным аспектах. У гербе ырвоны -
гэта «фамільны» колер князей іжаскага
роду Гедымінавічаў. Яго прадс у
чырвоным полі срэбны коннік ы займалі
ў грамадскіх і дзяржаўна-паліт ы ў XV -
XVI стст. вызначыла выбранне
Тышкевічаў, не меней вядома ерб
«Лелива» - залатая зорка з пау эшце,
Радзівілы валодалі гербам «Тр мі ў
блакітным полі і чорным арлом
У цэнтры герба Любані намаляваны стылізаваны чарот або нераскрыты бутон кветкі, на лісці якога сядзяць дзве птушкі. Мастацкі малюнак гэтых геральдыченых фігур выкананы ў стылі дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва. Тут можна правесці параллель паміж геральдыкай, якая прыйшла да нас з Заходняй Еўропы, дзе ў кожнай краіне свае традыцыі, і адным з выглядаў народнага творчества, таксама што маюць глыбокія народныя карані.
Аўтар герба і мастак А.У.Леўчык

# Дзякуй за ўвагу!
# Канец …




Прэзентацыю зрабіў Кулакоў Павел